Источник: "Настаўніцкая газета" - 2015-04-14



# Высокае званне — знакамітаму выпускніку

**Вядомы айчынны навуковец, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар і пісьменнік У.В.Гніламёдаў стаў ганаровым доктарам БрДУ імя А.С.Пушкіна. Рашэнне аб прысваенні знакамітаму выпускніку гэтага звання прыняў савет універсітэта.**

Падчас сустрэчы з У.В.Гніламёдавым рэктар БрДУ імя А.С.Пушкіна Г.М.Сендзер адзначыла заслугі вядомага літаратуразнаўца перад беларускай навукай, яго важкі ўклад у падрыхтоўку маладых навукоўцаў, высокі прафесіяналізм і адданасць любімай справе. Акрамя мантыі ганаровага доктара, Уладзімір Васільевіч атрымаў з рук рэктара сімвалічны падарунак — заліковую кніжку студэнта Гніламёдава, дзе былі толькі выдатныя адзнакі.

У.В.Гніламёдаў прызнаўся, што яму вельмі прыемна атрымаць высокае званне ганаровага доктара менавіта ў альма-матар, бо ён ніколі не парываў сувязей ні з роднай Брэстчынай, ні з БрДУ імя А.С.Пушкіна. Прафесар пабываў на філалагічным факультэце, дзе сустрэўся з яго выкладчыкамі і студэнтамі, работнікамі культуры і настаўнікамі Камянеччыны, адкуль ён родам.

ДЕТСКИЙ ОТ
СОЛНЕЧНЫЙ БЕРЕГ и КРАНЕВ
ОРГАНИЗАЦИЯ ПОЕЗДОК НА ТЕ
ДЕТСКИЙ ОТДЫХ НА МОРЕ в ИТ
ЭКСКУРСИОННЫЕ ТУРЫ по Евр

ISSN 1994-9146

Сяргей Грышкевіч. Высокае званне - знакамітаму выпускніку